# Турнір знаўцаў роднай мовы
# “Паўтараем, на роднай мове размаўляем!”

Настаўнік беларускай мовы і літаратуры Сянюк Н.М.

**Мэты і задачы:**

- ✓ далучыць дзяцей да духоўных скарбаў свайго народа;
- ✓ фарміраваць цікавасць і павагу да роднага слова, беларускай мовы як актыўнага сродку патрыятычнага і нацыянальнага выхавання;
- ✓ садзейнічаць развіццю культуры разумовай працы;
- ✓ садзейнічаць выхаванню ў вучняў нацыянальнай самасвядомасці праз асэнсаванне нацыянальных каштоўнасцей, праз любоў да роднай мовы.

Ход мерапрыемства

Добры дзень, паважаныя сябры! Калі вы жадаеце даведацца аб чым мы сёння будзем весці гутарку, то ўтульна ўладкуйцеся і паслухайце.

(*Гучыць павольная мелодыя, пад якую чытаецца тэкст.)*

Беларусь, Айчына.
Родны дом...
Я спялю
Надзеі кволы колас.
Покуль мы
Гаворым і пяём,--
Будзе жыць
І твой крынічны голас!
Нашу мову
Нельга адабраць!
Прывітаюць
Родным словам вусны.
Нашай мове
Нельга паміраць,
Бо тады памруць і беларусы.

Гэтымі цудоўнымі радкамі пра родную мову беларускай паэткі Лідзіі

Полазавай мы пачынаем наш турнір.

Давайце пазнаёмімся з удзельнікамі. (Прадстаўленне каманд)

## “ЗНАЙДЗІЦЕ ДЭВІЗ”

Знайдзіце дэвіз нашага турніра ў наборы літар і падкрэсліце патрэбныя словы. На выкананне даецца 2 хвіліны. 2 балы за правільны адказ.

| |
|---|
| Аўпрынескувлапростаябглоіўсловыгдоктсамыаўзросгуляемцявакеннароднайдосмуя мовезюгіханкразмаўляемвукепрало |

Беларусы. Адкуль мы? Хто мы? Чым слаўныя ў свеце? На гэтыя пытанні мы сёння і адкажам, правёўшы турнір знаўцаў роднай мовы. Дзякуючы гэтаму, мы даведаемся, хто з вас самы актыуны, знаходлівы і разумны, хто любіць і паважае сваю мову.

Але ў пачатку хачу вам сказаць па сакрэту, што сення раніцай да нас завітаў паштальён і прынёс тэлеграму ад чараўніка Хатабыча. Зараз я вам яе зачытаю: “Паважаныя дзеці, я вельмі жадаю прыехаць да вас, але я не ведаю як называецца ваша краіна. Калі ласка, дапамажыце мне!”

Ну, што, дапаможам? Тады для гэтага давайце разгадаем крыжаванку.

Пытанні да крыжаванкі:

1. Стаяць слупы бялёныя, на іх шапкі зялёныя........................…  Бяроза.
2. Ляціць, а не птушка, вые, ане звер..........................................  Вецер.
3. Якая краіна мяжуе з нашай з паўночнага захаду?................…………  Літва.
4. Якая краіна мяжуе з нашай з поўначы?...............................………  Латвія.
5. Вечарам нараджаецца, ноч жыве, а раніцай памірае...........…..  Раса.
6. Якая краіна мяжуе з нашай з поўдня?.......................................  Украіна
7. Якая краіна мяжуе з нашай з поўначы і ўсходу?......................  Расія.
8. Якая краіна мяжуе з нашай з захаду?......................................  Польша.

| | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | **Б** | Я | Р | О | З | А | |
| | | В | **Е** | Ц | Е | Р | | | |
| | | | **Л** | І | Т | В | А | | |
| | | Л | **А** | Т | В | І | Я | | |
| | | | **Р** | А | С | А | | | |
| | | | **У** | К | Р | А | І | Н | А |
| | Р | А | **С** | І | Я | | | | |
| П | О | Л | **Ь** | Ш | А | | | | |

Добра, малайцы, вось мы і адказалі на гэта пытанне. А зараз давайце ўспомнім якія беларускія святы вы ведаеце. Наступны конкурс "Кола беларускіх свят". Я буду зачытваць вам апісанне свята, а вы павінны адгадаць, як яно называецца.

*"Назва гэтага свята паходзіць ад лацінскага, што азначае першы дзень кожнага месяца. Раней яно святкавалася з 24 снежня па 6 студзеня, а зараз з 7 па 19 студзеня.*

*Гэта народны абрад, прызначэннем якога было паскорыць набліжэнне цёплых дзён. Характэрнай рысай гэтага свята была варажба. Варажылі на будучага мужа ці жонку, пра жыццё ў будучыні, пра багацце, здароўе і інш."*

*(КАЛЯДЫ)*

*"Гэтае свята адзначалася ў другой палове лютага — першай палове сакавіка. Яно было прысвечана провадам зімы і набліжэнню вясны. У гэты дзень пачыналі ігрышчы, усе багата частаваліся смачнай ежай, асабліва блінамі з маслам. У апошні дзень свята людзі прасілі прабачэнне ў тых, каго пакрыўдзілі.*

*Гэта першае вясновае свята ў гонар сонца."(МАСЛЕНІЦА)*

Добра, а зараз зробім наадварот: я вам назаву свята, а вы мне пра яго раскажаце. Назавіце галоўны атрыбут свята Купалле? (Папараць кветка). Калі яго адзначаюць? (6-7 ліпеня).

Але ж які сапраўдны беларус не ведае сваей гісторыі?

Зараз мы праверым, як вы ведаеце не толькі гісторыю, але і літаратуру, і геаграфію. Для гэтага правядзем віктарыну.

Пытанні: Адказы:

1. Беларускі першадрукар........................................................... Скарына.
2. Найбліжэйшы прыемнік Скарыны на Беларусі........................ Сымон Будны.
3. Знаемы вам горад, у якім жыў Сымон Будны......................... Клецк.
4. Каранны жыхар Рэспублікі Беларусь........................................ Беларус.
5. Майстар па вырабу глінянага посуду....................................... Ганчар.
6. Майстар па вырабу тканіны...................................................... Ткач.
7. Майстар па вырабу ювелірных упрыгожванняў........................ Ювелір.
8. Самы вялікі горад у Беларусі (сталіца Бел арусі)...................... Мінск.
9. Рака, на якой стаіць горад Мінск............................................... Няміга.
10. Беларуская вёска, спаленая разам з жыхарамі........................... Хатынь.
11. Тое, што патрабуе разгадкі або тлумачэння.............................. Загадка.
12. Народнае гулянне, рух людзей па крузез песнямі і пляскамі........................................................................ Карагод.
13. Народны музычны інструмент...........................................Скрыпка.

**КОНКУРС "РАМОНАК".**

Зараз 5 жадаючых выйдуць да рамонка і па чарзе выцягнуць па пялёстку. На кожным пялёстку напісаны заданні. Вы маеце права ўзяць каго-небудзь з сяброў на дапамогу.

Заданні:

1-2 пялёсткі. Прачытаць верш беларускага паэта.

3-4 пялёсткі. Праінсцэніраваць беларускую казку.

5 пялёстак. Праспяваць песню (пажадана на беларускай мове).

На падрыхтоўку вам даецца 2-ве хвіліны.

Жыццё не стаіць на месцы. Змяняецца час, змяняецца і мова. Многія словы ўжо выйшлі з актыўнага ўжытку або замяніліся на іншыя. Перад удзельнікамі стаіць нялёгкая задача, бо ім трэба даць тлумачэнне прапанаваным у заданні словам.
Наступнае заданне так і называецца **“СТАРАЖЫТНАЯ МОВА – СУЧАСНАЙ АСНОВА”.**

(Камандам раздаюцца заданні)

Выбраць правільны адказ.

Пытанне 1: растлумачце значэнне слова аліва.
- гэта сучасны алей;
- гэта вечназялёнае дрэва (маслічная культура) або плод гэтага дрэва;
- гэта змазачнае масла.

Пытанне 2: растлумачце значэнне слова каласавік.
- гэта колас, вырaслы на мяжы;
- гэта ранні баравік, што вырас падчас каласавання жыта;
- гэта час уборкі збожжавых культур.

Пытанне 3: растлумачце значэнне слова пячыста.
- гэта пячная труба (комін);
- гэта страва, прыгатаваная з вялікіх кавалкаў мяса;
- гэта печыва (пячэнне), у цеста якога замест цукру дабаўляецца мёд.

Далей мы даведаемся, ці добра вы ведаеце прыказкі, як беларускія, так і рускія. Дапаможам тым, хто не разумее прыказкі на беларускай мове, успомнім падобныя прыказкі на рускай мове.

| № | **На беларускай мове.** | **На рускай мове.** |
|---|---|---|
| 1. | Цесна сядзець, ды добраглядзець. | В тесноте да не в обиде. |

| | | |
|---|---|---|
| | Дзе цесна, там пацешна. | |
| 2. | Кухар спіць, а суп кіпіць | Солдат спит, а служба идёт. |
| 3. | Ціхая вада грэблю рве. | В тихом болоте черти водятся. |
| 4. | Умей узяць, умей і аддаць. | Долг платежом красен. |
| 5. | Адклад не ідзе ў лад. | Не откладывай на завтра то, что можно сделать сегодня. |

Родная мова мае вялікае значэнне для кожнай нацыі, кожнага народа, бо няма народа без мовы, няма мовы без яе носьбіта. І мы, беларусы, не выключэнне. Нам у спадчыну засталася ўнікальная мова – жывая і мілагучная, песенная і паэтычная, старажытная і сучасная.

Чалавек лічыцца высокаадукаваным, калі ён правільна выказвае свае думкі, будуе сказы, у словах правільна ставіць націск. Наступны конкурс нашага турніру так і называецца: “Гавары на роднай мове правільна”. (Камандам раздаюцца заданні.)

Пастаўіць націск у словах:

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| адзінАццаць | малЕнькі | садавінА | фартУх | сівЫ |
| грамадзЯнін | стАтуя | ільнянЫ | бульбЯны | рубЕль |
| вУсы | цаглЯны | вЫпадак | мышлЕнне | хрысціЯнін |
| крапівА | кулінАрыя | спІна | мЫсленне | занЯтасць |

Конкурс на лепшага знаўцу фразеалагізмаў.
Растлумачце сэнс фразеалагізмаў.

| | |
|---|---|
| Дайсці да пугі | Збяднець |
| Разводзіць рукамі | Здзіўляцца |
| Пусціць у ход | Прымяніць |
| Збіцца з панталыку | Памыліцца |
| У свіныя галасы | Позна |
| Як пшаніцу прадаўшы | Моцна спаць |
| Паставіць на калені | Скарыць |
| Бярозаю ліцца | Горка плакаць |
| Акунёў лавіць | Драмаць |
| Непачаты край | Многа |

Нашы продкі – бацькі, дзяды і прадзеды – нямала зрабілі для таго, каб наша беларуская мова была прызнанай роўнай сярод іншых моў свету. Любіце, ведайце і шануйце мову свайго народа і ўмейце дасканала валодаць ёю.Малайцы, я ўпэўнілася, што ўсе вы — сапраўдныя беларусы. Я вамі ганаруся. Дзякуй усім за гульню.

Дапабачэння.